ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
17.03.2020 №28

# Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Асновы моўнай культуры» для I–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Асновы моўнай культуры» прызначана для I–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Мэта – павышэнне ўзроўню маўленчай культуры дзяцей малодшага школьнага ўзросту, выхаванне і ўзбагачэнне іх індывідуальнага маўленчага вопыту, развіццё моўнай асобы.

3. Задачы:

развіваць у навучэнцаў маўленчы апарат, здольны каардынаваць моўнарухальныя і слыхавыя адчуванні;

фарміраваць здольнасць разумець лексічныя і граматычныя моўныя значэнні;

удасканальваць камунікатыўныя якасці маўлення вучняў;

развіваць крытычнае мысленне і творчыя здольнасці навучэнцаў;

фарміраваць цікавасць да літаратурных твораў на беларускай мове, культурнай і гістарычнай спадчыны беларусаў.

4. Структура заняткаў можа быць розная ў залежнасці ад пастаўленай мэты і сфармуляваных задач. Як правіла, яна ўключае ўводзіны ў тэму (пастаноўка праблемнага пытання, загадванне загадкі і інш.), чытанне настаўнікам тэксту з мэтай выпрацоўкі ў вучняў навыку аўдзіравання, работу з тэкстам для фарміравання камунікатыўных якасцей маўлення, арганізацыю камунікатыўных сітуацый, работу з фразеалагізмамі, розныя віды гімнастык (дыхальную, артыкуляцыйную, пальчыкавую), маляванне з наступным апавяданнем пра змест сваёй працы, дыдактычныя гульні, рэфлексію.

У I класе на тэкстах пра з’явы прыроды выпрацоўваецца правільнасць маўлення дзяцей, фарміруецца тэхніка маўлення, асноўнымі кампанентамі якой з’яўляюцца дыханне, голас, дыкцыя, вымаўленне.

У II класе дзеці знаёмяцца з прыродай Беларусі, старажытнымі гарадамі і паданнямі. Пры гэтым пашыраецца слоўнікавы запас вучняў, мова ўзбагачаецца ўстойлівымі зваротамі, удасканальваецца тэхніка маўлення.

У III класе навучэнцы атрымліваюць пэўныя звесткі пра народныя рамёствы і промыслы, сучасныя рэчы і тэхніку. Асаблівая ўвага звяртаецца на багацце, дакладнасць, выразнасць маўлення. Працягваецца праца над засваеннем устойлівых словазлучэнняў.

Для назірання, чытання і абмеркавання ў IV класе выкарыстоўваюцца тэксты пазнавальнага характару, якія пашыраюць веды дзяцей пра жыццё людзей і прыроду на нашай планеце, і тэксты,

накіраваныя на асэнсаванне найважнейшых каштоўнасцей чалавека: маральны стан, ўчынкі, узаемаадносіны і інш. Дзеці вучацца логіцы выказвання, уменню абгрунтоўваць свае думкі.

5. Асноўнымі метадамі навучання з'яўляюцца моўныя гульні (у тым ліку і з выкарыстаннем персанальнага камп'ютэра), дыялогі, камунікатыўныя практыкаванні, слуханне і чытанне фальклорных і літаратурных тэкстаў, элементарны моўны аналіз тэкстаў, гутарка, завучванне на памяць невялікіх вершаў, развучванне песень, драматызацыя і інш.

Пры выбары форм арганізацыі неабходна пазбягаць дубліравання ўрокаў беларускай мовы, фармалізацыі маўленчага асяроддзя. Пажадана выкарыстоўваць формы, характэрныя для пазакласнай работы: ранішнікі, конкурсы, народныя святы, экскурсіі ў этнаграфічны (гістарычны) музей, наведванне тэатраў, мастацкіх выставак і г.д., прыцягваць вучняў да падрыхтоўкі заняткаў, абуджаць у іх ініцыятыву ў выбары спосабаў арганізацыі і правядзення асобных частак заняткаў.

Факультатыўныя заняткі могуць праводзіцца ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Настаўнік мае права ўнесці пэўныя карэктывы ў змест і структуру занятку у залежнасці ад маўленчай падрыхтаванасці вучняў, узросту і псіхалагічных асаблівасцей, сфарміраванасці моўнай культуры.

6. У выніку засваення зместу вучэбнай праграмы факультатыўных заняткаў «Асновы моўнай культуры»:

6.1. вучні I класа павінны:

ведаць:

адметныя прыкметы розных пор года;

лексіка-граматычны матэрыял, актуальны для камунікатыўнай дзейнасці ў адпаведнасці з прапанаванай тэмай;

прозвішчы знакамітых беларускіх пісьменнікаў, з творамі якіх знаёміліся на занятках;

умець:

разумець на слых інфармацыю, адэкватна рэагаваць на пабуджэнне да дзеяння з боку суразмоўца;

адрозніваць рускае і беларускае гукавымаўленне, умець ажыццяўляць беларускае артыкуляванне;

вылучаць словы і выразы, якія перашкаджаюць разуменню тэксту;

выкарыстоўваць маўленчыя сродкі для рашэння камунікатыўных і пазнаваўчых задач ў межах прапанаванай тэмы;

даваць разгорнутыя адказы на пытанні;

пераказваць тэкст па пытаннях і апорных словах;

маляваць словамі карціну прыроды;

6.2. вучні II класа павінны:

ведаць:

адметныя асаблівасці прыроды Беларусі;

пра ўзаемаадносіны паміж чалавекам і прыродай, беражлівае стаўленне да ўсяго жывога;

важнейшыя падзеі айчыннай гісторыі;

лексіка-граматычны матэрыял, актуальны для камунікатыўнай дзейнасці ў адпаведнасці з прапанаванай тэмай;

прозвішчы знакамітых беларускіх пісьменнікаў, з творамі якіх знаёміліся на занятках.

умець:

назіраць за асаблівасцямі ўжывання ў мове вобразных сродкаў;

маляваць словамі карціну прыроды;

вызначаць агульны эмацыяльны настрой твора, пачуцці, якія перадае аўтар;

ацэньваць правільнасць і выразнасць (гучнасць, захаванне інтанацыі сказа і паўз) пачутага чытання;

выкарыстоўваць маўленчыя сродкі для рашэння камунікатыўных і пазнавальчых задач ў межах прапанаванай тэмы;

адказваць і ставіць пытанні па змесце з выкарыстаннем слоў пачутага ці прачытанага твора;

складаць уласнае выказванне, будаваць яго ў пэўнай лагічнай паслядоўнасці;

выяўляць сэнсавыя сувязі паміж падзеямі;

вызначаць месца, час, абставіны падзей;

разумець сэнс устойлівых словазлучэнняў, свядома выкарыстоўваць іх у моўнай практыцы;

6.3. вучні III класа павінны:

ведаць:

народныя рамёствы і промыслы Беларусі;

сучасныя рэчы і машыны, іх прызначэнне;

лексіка-граматычны матэрыял, актуальны для камунікатыўнай дзейнасці ў адпаведнасці з прапанаванай тэмай;

прозвішчы знакамітых беларускіх пісьменнікаў, з творамі якіх знаёміліся на занятках.

умець:

выкарыстоўваць маўленчыя сродкі для рашэння камунікатыўных і пазнавальчых задач ў межах прапанаванай тэмы;

выкарыстоўваць словы ва ўласцівым значэнні, дакладна ўжываць іх у мове;

адказваць і ставіць пытанні па змесце з выкарыстаннем слоў пачутага ці прачытанага твора;

аналізаваць твор па тэкставых заданнях;

весці дыялог;

складаць уласнае выказванне, будаваць яго ў пэўнай лагічнай паслядоўнасці; праводзіць адбор неабходных моўных сродкаў;

падбіраць інфармацыю для абагульнення прапанаванага матэрыялу;

прымаць удзел у гутарцы з элементамі апісання, разважання;

разумець сэнс устойлівых словазлучэнняў, свядома выкарыстоўваць іх у моўнай практыцы;

перадаваць інтанацыю на падставе знакаў прыпынку ў канцы сказа, захоўваць паўзы ў адпаведнасці са знакамі прыпынку.

6.4. вучні IV класа павінны:

ведаць:

элементарныя звесткі пра планету Зямля, пра чалавека як асобу;

лексіка-граматычны матэрыял, актуальны для камунікатыўнай дзейнасці ў адпаведнасці з прапанаванай тэмай;

прозвішчы знакамітых беларускіх пісьменнікаў, з творамі якіх знаёміліся на занятках.

умець:

прагназаваць змест твора па загалоўку, ілюстрацыях і апорных словах;

аналізаваць твор па тэкставых заданнях;

складаць уласнае выказванне, будаваць яго ў пэўнай лагічнай паслядоўнасці; праводзіць адбор неабходных моўных сродкаў;

ярка перадаваць лагічны і эмацыянальны змест выказвання, свабодна замяняць словы ў мэтах удасканалення тэксту;

падбіраць інфармацыю для абагульнення прапанаванага матэрыялу;

прымаць удзел у гутарцы з элементамі апісання, разважання;

разумець сэнс устойлівых словазлучэнняў, свядома выкарыстоўваць іх у моўнай практыцы;

рыхтаваць паведамленне на зададзеную тэму;

слухаць суразмоўцу і весці дыялог, прызнаваць наяўнасць розных пунктаў погляду, выказваць сваё меркаванне і аргументаваць яго.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### I клас (34 гадзіны, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)

#### Гукі і фарбы восені (11 гадзін)

Гукі вакол нас. «Мова» лесу, вуліц, жывёл, птушак. Мова чалавека. Патрабаванні да маўлення чалавека.

Гукі і фарбы залатой восені. Назіранне за асеннім лесам, яго гукамі і фарбамі. Перадача асобасных уяўленняў у творчасці пісьменнікаў і

мастакоў. Сваё бачанне залатой восені.

Восеньскія прыметы і з’явы: туманы, бабіна лета, замаразкі, дажджы. Назіранне ў прыродзе за гэтымі з’явамі.

Дары восені: дары поля, лесу, саду.

Позняя восень. Яе гукі і фарбы. Параўнанне залатой і позняй восені.

Абагульненне па тэме. Свята восені.

Ідзе, спяшаецца зіма (5 гадзін)

Напярэдадні зімы. Назіранне за небам, паветрам, хмарамі. Подых зімы.

Першы снег. Радасць ад першага снегу. Сняжынкі. Гукі і фарбы снежня.

Зіма ў лесе. Назіранні ў прыродзе. Зімовы лес у творчасці пісьменнікаў і мастакоў. Зімовы лес ва ўяўленнях дзяцей. Пошукі перадачы сваіх уяўленняў сродкамі мовы.

Сустракаем Новы год. Навагодняя ёлка. Колеры і настрой. Навагоднія падарункі. Калі і як сустракаюць Новы год у іншых краінах свету.

Зіма, зіма марозная (6 гадзін)

Ой, калядачкі! Народныя традыцыі і абрады. Калядныя песні і гульні.

Якая ты, зіма? Зімовы ранак. Сонечны марозны дзень. Завея, мяцеліца, адліга. Зімовы вечар. Назіранне за надвор’ем.

Зімовыя забавы. Горка, каток, снежная баба.

Жывёлы зімой. Птушкі зімой. Птушыныя сталоўкі. Жыццё звяроў зімой.

Зімовыя месяцы. Назвы, іх паходжанне.

Бывай, зіма марозная! Народныя традыцыі. Провады зімы.

Напрадвесні (4 гадзіны)

Подых вясны. Сакавіцкі снег. Крыгаход. Паводка. Раўчукі. Дзіцячая флатылія.

8 Сакавіка. Свята мам, бабуль, сястрычак. Абуджэнне лесу: дрэў, звяроў. Прылёт птушак. Гуканне вясны. Падрыхтоўка і правядзенне свята.

Лёгкія крылы вясны (7 гадзін)

Красавік ідзе з пралескамі. Першацветы. Назіранне ў прыродзе. Вусныя малюнкі.

Фарбы і гукі мая. Назіранне за лесам, полем, небам. Дождж. Вясёлка. Майскія кветкі.

Чакаем, лета, мы цябе. Спякота. Навальніца. На лузе летам.

Абагульненне. Свята «Месяц за месяцам».

Рэзерв (1 гадзіна).

II клас (34 гадзіны, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)

Мой зялёна-блакітны край (8 гадзін)

Беларусь лясная. У асеннім лесе. Птушыныя песні. Ляснымі сцяжынкамі. Белавежская пушча. Зубр – гаспадар Белавежскай пушчы. Жывёлы беларускіх лясоў – героі беларускіх казак.

Мой зялёна-блакітны край (9 гадзін)

Водныя прасторы Беларусі. Беларусь рачная. Беларусь азёрная. Жывёлы рэк, азёр, балот у казках і паданнях. Птушкі азёр, балот. Жывёльны свет рэк і азёр: рыбы, ракі. Беларускія крыніцы. Да прыроды – з любоўю і клопатам.

Абагульненне. Мой зялёна-блакітны край.

Старажытная Беларусь (16 гадзін)

Старажытныя часы. Плямёны: дрыгавічы, крывічы, радзімічы.

Жыццёвыя асновы. Агонь – крыніца жыцця. Сонца, сонейка, свяці! Вада ў жыцці людзей. Родная зямля.

Памяць пра легенды. Добрыя і злыя духі ў казках і паданнях.

Паселішчы Беларусі. Назвы гарадоў на карце Беларусі. Сталічныя гарады. Паданні і легенды. Гербы беларускіх гарадоў.

Абарончыя збудаванні на беларускай зямлі. Замкі і крэпасці. Іх значэнне ў старажытнасці і сучаснасці. Міфы і легенды.

Асветнікі Беларусі. Ефрасіння Полацкая, Сімяон Полацкі, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына. Значэнне ведаў у жыцці чалавека.

Абагульненне па тэме. Люблю цябе, мая Радзіма.

Рэзерв (1 гадзіна).

III клас (35 гадзін, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)

Народныя рамёствы і промыслы (17 гадзін)

Уводзіны. Майстрамі багатая Беларусь.

Горад майстроў. У кузні. Ткацтва. Матэрыялы для ткацтва: воўна, лён. Беларуская народная вышыўка. У швейнай майстэрні. Майстрыхі-вязальшчыцы. Казка горада майстроў. Беларускі касцюм. У майстэрні шаўца.

Горад майстроў. Пляценне. Матэрыялы для пляцення: лаза, саломка. У майстэрні сталяра. Інструменты. Разьба па дрэве. У майстэрні ганчара. Як нараджаецца посуд. Беларуская кераміка. У гасцях у млынара. Адкуль бярэцца мука. Майстар-пекар. Хлеб – усяму галава.

Экскурсія ў этнаграфічны музей.

Абагульненне па тэме. Запрашаем на кірмаш.

Беларусь сучасная (17 гадзін)

У свеце рэчаў і машын. Гадзіннік. Электрычная лямпачка.

Тэлевізар. Любімыя тэлеперадачы. Тэлефон. Важныя нумары. Размаўляем па тэлефоне. Камп'ютар. Пыласос, прас, халадзільнік. На чым прыгатаваць ежу. Мой цёплы дом. Як рэчы мне дапамагаюць.

У свеце рэчаў і машын. Машыны на вуліцах горада. Гарадскі транспарт. Машыны на будоўлі. Машыны на палях. Паветраны транспарт. Рачны транспарт. Чыгунка. Падземная дарога.

Абагульненне па тэме. Машыны на службе чалавека.

Рэзерв (1 гадзіна).

IV клас (35 гадзін, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)

З роднай мовай па планеце (17 гадзін)

Сонца і Сонечная сістэма. Планета Зямля. Месяц – спадарожнік Зямлі. Водныя прасторы: моры і акіяны. Найвялікшыя рэкі планеты. Горы. Пустыні.

Вандруем па планеце. Старажытная Еўропа. Такая розная Афрыка. Амерыка паўночная. Амерыка паўднёвая. Краіны Блізкага, Сярэдняга і Дальняга Усходу. Загадкавая Аўстралія. Артыка і Антарктыда – палюсы холаду.

Я – чалавек (17 гадзін)

Чалавек і яго пачуцці: радасць, гора, любоў, нянавісць і інш.

Чалавек і яго якасці: дабрыня, шчодрасць, смеласць, эгаізм, міласэрнасць і інш.

Чалавек і яго блізкія: бацькі, браты, сёстры, бабулі і дзядулі, сябры.

Чалавек і яго справы. Дасягненні чалавека ў навуцы, тэхніцы, літаратуры, мастацтве, спорце.

Чалавек і яго мары. Быць чалавекам. Выбар прафесіі. Знакамітыя людзі свету. Што я хачу зрабіць для Беларусі.

Рэзерв (1 гадзіна).